ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

**ГАЛОЎНАЕ ЎПРАЎЛЕННЕ
ІДЭАЛАГІЧНАЙ РАБОТЫ,
КУЛЬТУРЫ І ПА СПРАВАХ МОЛАДЗІ**

ГОМЕЛЬСКИЙ ОБЛАСТНОЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**ГЛАВНОЕ УПРАВЛЕНИЕ
ИДЕОЛОГИЧЕСКОЙ РАБОТЫ,
КУЛЬТУРЫ И ПО ДЕЛАМ МОЛОДЁЖИ**

# ЗАГАД

# ПРИКАЗ

31.01.2023 № 12

г. Гомель

г. Гомель

Аб правядзенні абласнога
конкурсу гульневых
праграм «Зажигай-ка»

З мэтай павышэння прафесійнага ўзроўню спецыялістаў культурна-дасугавых устаноў у правядзенні гульневых праграм, выяўлення, абагульнення і распаўсюджвання вопыту работы
ЗАГАДВАЮ:

1. Правесці абласны конкурс гульневых праграм «Зажигай-ка» (далей – абласны конкурс) ў рамках свята сямейнай творчасці «Жывіце ў радасці» у маі 2023 года ў г. Рэчыцы.

2. Зацвердзіць палажэнне, склад аргкамітэта (дадаткі 1, 2).

3. Арганізацыю і правядзенне абласнога конкурсу ўскласці на ўстанову «Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці» (Сафрановіч Н.Д.), аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Рэчыцкага райвыканкама (Краўчанка С.Г.).

4. Фінансавыя выдаткі па арганізацыі і правядзенню абласнога конкурсу ажыццявіць за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных установе «Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці» на правядзенне цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў у рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2021-2025 гг.

5. Начальнікам аддзелаў (упраўлення) ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкамаў, Гомельскага гарвыканкама аказаць садзейнічанне ў арганізацыйным забеспячэнні ўдзелу культработнікаў у абласным конкурсе.

6. Кантроль за выкананнем дадзенага загада ўскласці на першага намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама Заўгародную І.С.

Начальнік галоўнага ўпраўлення — Д.У.Езерскі

ГУ 0009235

Зак. 6555–3000.

Дадатак 1
да загада галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта
ад 31.01. 2023 г. № 12

ПАЛАЖЭННЕ
аб правядзенні абласнога конкурсу
гульневых праграм «Зажигай-ка»

**1. Мэты абласнога конкурсу.**

Абласны конкурс гульневых праграм «Зажигай-ка» (далей – абласны конкурс) праводзіцца ў мэтах:

стымулявання прафесійнага росту культработнікаў у правядзенні гульнёвых праграм і далейшага павышэння іх мастацкага ўзроўню;

папулярызацыі новых форм і ідэй у арганізацыі актыўнага адпачынку розных узроставых груп насельніцтва;

стварэнню ўмоў для эфектыўных творчых кантактаў спецыялістаў культурна-дасугавай дзейнасці, абмена вопытам работы.

**2. Кіраўніцтва абласным конкурсам.**

Для падрыхтоўкі і правядзення абласнога конкурсу ствараецца абласны арганізацыйны камітэт, у склад якога ўваходзяць прадстаўнікі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама, установы «Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці» і аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Рэчыцкага райвыканкама.

У перыяд падрыхтоўкі абласнога конкурсу аргкамітэт далучае сродкі масавай інфармацыі да асвятлення ходу абласнога конкурсу, дапамагае ў яго правядзенні, ажыццяўляе непасрэднае кіраўніцтва абласным конкурсам у тэрмін правядзення мерапрыемства.

**3. Умовы і парадак правядзення абласнога конкурсу.**

Абласны конкурс праводзіцца ў маі 2023 года ў г. Рэчыцы.

У абласным конкурсе прымаюць удзел работнікі раенных, гарадскіх, сельскіх устаноў культуры клубнага тыпу.

**Патрабаванні да конкурсных выступленняў.**

Конкурсныя выступленні праводзяцца па наступных групах:

сярод гарадскіх, раенных устаноў культуры клубнага тыпу;

сярод сельскіх устаноў культуры клубнага тыпу.

На конкурс прадстаўляюцца гульневыя, конкурсныя, сюжэтна-гульневыя, фалькл орныя праграмы.

Працягласць конкурсных выступленняў да 15-ці хвілін.

Заяўкі на ўдзел у абласным конкурсе дасылаюцца **да 1 красавіка 2023 года** на электронны адрас: ltikdd@ocntgomel.by установа «Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці», аддзел аматарскай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці (форма заяўкі дадаецца).

**4. Падвядзенне вынікаў абласнога конкурсу і ўзнагароджванне.**

Журы будзе ўлічваць:

арыгінальнасць выбранай формы і рэжысерскае рашэнне;

сцэнічнае майстэрства (артыстызм, культура мовы, камунікабельнасць, уменне арыентавацца ў прасторы);

мастацкае і музычнае суправаджэнне, якасць фанаграм.

Па выніках конкурсных выступленняў журы вызначае пераможцаў у кожнай з двух груп з уручэннем дыпломаў і падарункаў:

дыплом І ступені і падарунак на суму ў памеры да 2,5 базавых велічынь;

дыплом ІІ ступені і падарунак на суму ў памеры да 2 базавых велічынь;

дыплом ІІІ ступені і падарунак на суму ў памеры да 1,5 базавых велічынь.

Арганізацыйны камітэт абласнога конкурсу прадугледжвае ўзнагароджванне дыпломамі і падарункамі на суму ў памеры 1 базавай велічыні ў 2-х спецыяльных намінацыях:

аўтарская праграма;

сучасная фальклорная праграма.

Усе астатнія ўдзельнікі абласнога конкурсу ўзнагарождваюцца граматамі за ўдзел.

Пры неабходнасці журы мае права прысудзіць не ўсе дыпломы, змяніць намінацыі або ўвесці новыя. Рашэнне журы канчатковае і перагляду не падлягае. У выпадку непрысуджэння, падзелу месцаў паміж удзельнікамі дапускаецца падзел падарункаў у межах прадугледжаных сродкамі абласнога бюджэту.

**5. Фінансаванне.**

Фінансавыя выдаткі па арганізацыі і правядзенню абласнога конкурсу ажыццяўляюцца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных установе «Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці» на правядзенне цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў у рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2021-2025 гг.

**6. Камандзіровачныя і транспартныя выдаткі.**

Транспартныя і камандзіровачныя выдаткі ўдзельнікаў абласнога конкурсу ажыццяўляюцца за кошт накіроўваючага боку.

**7. Кантакты.**

Адрас: 246022, г. Гомель, вул. Кірава, 49, установа «Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці».

e-mail:ltikdd@ocntgomel.by

Кантактны нумар (0232) 33-73-02, аддзел аматарскай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці, Хахракова Таццяна Уладзіміраўна.

Дадатак 2
да загада галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта
ад 31.01. 2023 г. № 12

СКЛАД
арганізацыйнага камітэта абласнога конкурсу гульнёвых праграм «Зажигай-ка!»

| | |
|---|---|
| Заўгародняя<br>Інга Сяргееўна | першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама, старшыня аргкамітэта |
| Сафрановіч<br>Наталья Дзмітрыеўна | дырэктар установы «Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці» |
| Краўчанка<br>Святлана Генадзьеўна | начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Рэчыцкага райвыканкама |

**Заяўка**
на ўдзел у абласным конкурсе
гульневых праграм «Зажигай-ка!»

1. Прозвішча, імя, імя па бацьку________________________________

2. Пасада, месца работы ________________________________

3. Адукацыя ________________________________

4. Назва конкурснай праграмы (дарослая альбо дзіцячая)
________________________________

5. Аўтарская праграма альбо ўзятая з друкаваных матэрыялаў (неабходнае падкрэсліць) ________________________________

6. Якое тэхнічнае забеспячэнне патрэбна для ажыццяўлення конкурснай праграмы ________________________________

7. Кантактны тэлефон (мабільная сувязь)
________________________________

Дырэктар установы